# Журналістыка

Т. У. ПАДАЛЯК

## ДУХОЎНАЕ СТАНАЎЛЕННЕ АСОБЫ: КАНСТРУКТЫЎНЫ І ДЭСТРУКТЫЎНЫ ЎПЛЫЎ МАЛАДЗЁЖНАГА ДРУКУ

Пра неабходнасць выхавання духоўнасці сёння гаворыцца шмат. Нараканні на бездухоўнасць моладзі сталі агульным месцам у размовах на самых розных узроўнях — у асяроддзі творчай інтэлігенцыі і кухонных «кулуарах», у парламенце і, канешне, у сродках масавай інфармацыі. Застойныя з'явы мінулых гадоў негатыўна адбіліся на духоўным стане грамадства, садзейнічалі дэвальвацыі маральных ідэалаў і каштоўнасцей, нарастанню дэфіцыту чалавечнасці і сацыяльнай справядлівасці. Сёння паўстала задача пераадолець гэтую заганную «спадчыну».

«Друк — гэта найбольш агульны для індывідаў спосаб раскрыцця іх духоўнага быцця»[1],— пісаў К. Маркс. Чалавек як асоба фарміруецца на працягу ўсяго жыцця, але маладосць — перыяд найбольш актыўных духоўна-маральных пошукаў. Маладзёжны друк адрасаваны менавіта гэтай узроставай катэгорыі, значыць, будзе правільным сцвярджаць, што ён з'яўляецца не толькі **спосабам** раскрыцця «духоўнага быцця» моладзі, а і дзейсным **фактарам** фарміравання гэтага «духоўнага быцця» (прычым як са знакам «плюс», так і са знакам «мінус»), фактарам фарміравання духоўнасці.

Хаця ў апошнія гады тэрмін «духоўнасць» ужываецца часцей, чым трэба, агульнапрынятага яго вызначэння пакуль няма. Гэта тлумачыцца, напэўна, і складанасцю прадмета даследавання, і тым, што духоўны свет асобы традыцыйна вывучаўся многімі навукамі — філасофіяй, псіхалогіяй, этыкай, эстэтыкай і нават фізіялогіяй вышэйшай нервовай дзейнасці чалавека.

У грамадскай свядомасці доўгі час панаваў стэрэатып, які звязваў, нярэдка і атаясамляў духоўнасць з рэлігіёзнасцю асобы. Таму саслоўе служыцеляў царквы сталі называць духавенствам. Філосафы-рацыяналісты Новага часу, каб адмежавацца ад рэлігіёзных мысліцеляў, наогул адмовіліся ад паняццяў «дух», «духоўнае», замяняючы іх тэрмінамі «свядомасць», «мысленне».

На наш погляд, можна сцвярджаць, што духоўнасць ёсць этычны ўзровень быцця. Чалавек духоўны ў той ступені, у якой яго ўнутранае жыццё, стыль паводзін і дзейнасці адпавядаюць агульначалавечым маральным каштоўнасцям. Што датычыцца друку, то ён у ідэале прызначаны сеяць разумнае, добрае, вечнае і выступае ў ролі своеасаблівай лакмусавай паперы, што дапамагае чалавеку вызначыць полюсы дабра і зла, мяжу ісціны і хлусні, ўзлёту і падзення. Гэта функцыя друку ў застойныя часы была зведзена амаль да нуля.

З 1985 года маладзёжны друк, як і іншыя сродкі масавай інфармацыі, паказаў сябе з найлепшага боку, стаў у авангардзе галоснасці, пачаў чуйна і дакладна ўлоўліваць змены ў грамадскай свядомасці, у псіхалогіі і мысленні людзей. Газеты «Комсомольская правда», «Чырвоная змена», «Знамя юности» пачалі ўсё больш упэўнена звяртацца да «закрытых» некалі тэм, здолелі выйсці на новы ўзровень распрацоўкі надзённых праблем рэчаіснасці.

Аднак усялякая рэвалюцыйная з'ява ўздымае наверх накіп і пену. Маладзёжны друк — не выключэнне, ён таксама не абмінуў крайнасцей і пера-

хлёстаў. Побач з прагрэсіўнай тэндэнцыяй павышэння аператыўнасці і пашырэннем інфармацыі на старонках газет з'яўляецца значная колькасць публікацыяй, якія не ўзбагачаюць, а, наадварот, духоўна збядняюць чытача. Бязмежнае крытыканства, смакаванне недахопаў і іх пастаяннае пражоўванне, «чорны» песімізм і таннае «сюсюканне» — усё гэта пачало адварочваць моладзь ад прэсы: маўляў, колькі ж можна чытаць пра ўсё гэта?!. (Рэзкае падзенне тыражоў многіх маладзёжных выданняў на 1991 год тлумачыцца, трэба меркаваць, не толькі падаражаннем падпіскі).

Нельга лічыць нармальнай і голую сенсацыйнасць, на якую робіць стаўку ў апошні час маладзёжны друк. Як слушна заўважае даследчык сучаснай журналістыкі А. Чычаноўскі, чытачы, сапраўды, «згаладаліся не толькі па праўдзівай, але і па «раскаванай» інфармацыі»[2]. Але ж сенсацыйнасць дзеля шоку, работа сугуба на патрэбу сённяшняга дня, па прынцыпу «чаго пажадаеце?» — ніколі не былі перспектыўнымі для прэсы, бо ператваралі яе ў служанку абывацеля. А ў друку, асабліва маладзёжным, прыкладна з 1988 года пачала ярка праяўляцца менавіта гэтая тэндэнцыя. На старонках «Комсомольской правды», «Чырвонай змены», «Знамени юности» ўсё большае месца займаюць матэрыялы пра секс і разбэшчанасць, пра НЛА, экстрасенсаў, хірамантаў, калдуноў, пра наркаманаў і таксікаманаў, пра гомасексуалістаў і прастытутак... Зараз, калі зняты ўсялякія «табу» і абмежаванні, калі мы, нарэшце, атрымалі Закон аб друку, як ніколі актуальным стала пытанне аб маральнай адказнасці і сумленнасці журналістаў. Канешне, на «клубнічна-малінавыя» тэмы пісаць лягчэй, на іх хутчэй «клюнуць» (асабліва калі матэрыял будуецца па прынцыпу «што бачу, тое і пішу»), але ж журналіст павінен думаць перш за ўсё пра каэфіцыент карыснага дзеяння свайго выступлення на старонках газеты. А калі ў яго няма пачуцця адказнасці за напісанае, то трэба весці гаворку пра адмоўны ўплыў прэсы на духоўнае станаўленне асобы, пра выхаванне бездухоўнасці.

Маладзёжныя газеты з трывогай адзначаюць: тое, што стагоддзямі было нельга (сорамна), зараз стала не толькі можна, але і... папулярна. Адна з шануемых маладзёжным друкам тэм — прастытуцыя. Калі чытаеш шматлікія газетныя матэрыялы, узнікае ўражанне, што рэдакцыйныя партфелі па гэтай тэматыцы невычарпальныя. Публікацый на «пікантныя» тэмы шмат, але, на думку супрацоўнікаў МУС, яны часцей прыносяць шкоду, а не карысць. Пра гэта расказвала «Комсомольская правда» 27 студзеня 1989 г. у артыкуле Н. Баяркінай «На панелі». Сапраўды: калі бярэшся лячыць, то галоўнае — не пашкодзь! У апошні час павялічылася колькасць правапарушэнняў, якія ўчыняюць прадстаўніцы старажытнейшай прафесіі, у іх асяроддзе сталі ўлівацца юныя дзяўчаты — па ўсяму відаць, не без «дапамогі» маладзёжнага друку. Можна прыгадаць аповесць В. Куніна «Інтэрдзяўчынка», якая нечакана стала бестселерам адразу пасля апублікавання ў часопісе «Аўрора» (№№ 2—3, 1988). Маладзёжкі не змясцілі ніводнай больш-менш глыбокай, сур'ёзнай рэцэнзіі на твор, дзе з захапленнем (інакш і не скажаш!) малюецца жыццё прастытутак.

У час працы над артыкулам «Узаконеная платная разбэшчанасць: ці магчыма? ці трэба?» («Чырвоная змена», 29 верасня 1990 г.) мне давялося размаўляць з многімі адказнымі камсамольскімі работнікамі. Амаль усе яны не супраць легалізацыі прастытуцыі, а ў самой «пікантнай» прафесіі... не бачаць нічога заганнага (!). Прынамсі, гэтае меркаванне можна лічыць заканамерным, калі ўважліва перагледзець старонкі маладзёжных газет за 1988—1989 гг. Напрыклад, 5 кастрычніка 1989 г. цэлы выпуск «Клуба цікаўных» «Комсомолка» прысвяціла сексу. Чаго тут толькі няма! І «Сумная гісторыя» С. Прутава аб школьным настаўніку фізкультуры, які расказвае сваім вучням, «як ён займаўся каханнем на падаконніку ў пад'ездзе і, відаць, ад лішку пачуццяў выдавіў аконнае шкло спінай сваёй суседкі». Тут і глыбокадумная парада-развражанне аб тым, што «з псіхалагічнага пункту гледжання будзе шмат карысней, калі першы практычны вопыт сексу жанчына атрымае яшчэ да таго, як выйдзе замуж... большасць людзей так і робіць» і многае іншае ў гэткім жа рэгістры.

Газета адрасавана чытачу, узрост якога ад 14 і болей: дык зусім не зразумела, чаму ўзаемаадносіны паміж мужчынам і жанчынай рэдакцыя зводзіць выключна да сексу, да біялогіі, а пра светлае пачуццё кахання — ані слова. Атрымліваецца: секс у нас ёсць, кахання — няма... Гэта вынікае таксама і з матэрыялаў тэматычнай старонкі «Чырвонай змены» «Адам і Ева». «Чырвонка», дарэчы, рэгулярна «балуе» свайго чытача і фотаздымкамі, якія, бадай што, маглі б паспаборнічаць з «плэйбоеўскімі».

Зноў — крайнасць: калі раней маладзёжкі баяліся хоць крыху саступіць ад ханжаскай маралі «зашпіленых гузікаў», то зараз заняліся ледзь не прапаведдзю разбэшчанасці. Толькі дзесьці з другой паловы 1990 г. пачала патроху мяняцца танальнасць матэрыялаў на гэтыя тэмы. Так, журналіст А. Лапін у артыкуле «Секстрасенсы» («Комсомольская правда», 28 кастрычніка 1990 г.) разважае: «Па сутнасці, уся гісторыя чалавецтва — гэта працэс выдзірання сябе з дзікарства і некультурнасці. Дык няўжо мільёны пакаленняў чалавецтва імкнуліся да таго, каб нашчадкі вярнуліся да дзікага стану? Мы павінны нарэшце ўсвядоміць, што ніводнае грамадства не выжыве, калі яно будзе разбэшчваць уласных дзяцей». Не разлічанае на штучную сенсацыйнасць, разумнае і глыбокае асвятленне ўсіх пытанняў і праблем у маладзёжнай прэсе будзе садзейнічаць духоўнаму адраджэнню грамадства, вяртанню ў жыццё вечных каштоўнасцей. Інакш нас чакае маральны тупік.

Леў Талстой запісаў у дзённіку 13 сакавіка 1900 г.: «Усё можна даравацъ, толькі не скажэнне тых вышэйшых ісцін, да якіх з такой цяжкасцю дайшло чалавецтва». Друк сведчыць: у грамадстве якраз і адбываецца злачынная пераацэнка каштоўнасцей. Адна з прычын, безумоўна,— функцыяніраванне камандна-адміністратыўнай сістэмы. Але ж справа не толькі ў гэтым, нельга ўсё тлумачыць знешнімі ўмовамі: чалавек павінен заставацца Чалавекам заўсёды, якімі б складанымі не былі абставіны. Чамусьці гэты нюанс газеты амаль не ўлічваюць. Маладзёжкі друкуюць шмат пісьмаў чытачоў, у якіх сваю амаральнасць некаторыя тлумачаць так: маўляў, я тут ні пры чым, жыццё дрэннае — і я такі. Людзі здымаюць з сябе ўсялякую адказнасць, свядома адмаўляюцца ад сумлення (?!). «Лічу, што менавіта з-за адсутнасці дастойнай мэты ў жыцці сярод нас ёсць новаспечаныя свідрыгайлавы, аднолькава здольныя рабіць і дабро, і зло»,— напісаў у «Комсомольскую правду» 20-гадовы Джамал Аджыеў (7 верасня 1989 г.)

Адсутнасць дастойнай мэты жыцця, бязвер'е ідзе і ад страты павагі да мінулага сваёй краіны, свайго народа. Некалі У. І. Ленін ваяўніча выступаў супраць нігілізму ў адносінах да папярэдняй культуры. Паўтараемасць памылак — наша пакаранне, наш крыж. Мы зноў так перакрэслілі сваё, ужо сацыялістычнае мінулае, што стварылі ўражанне, быццам з 1917 г. ішлі толькі шляхам памылак. Пры аналізе публікацый маладзёжных газет на гістарычныя тэмы звяртае ўвагу імкненне ўсё без разбору «ускалмачваць». Дзеля гэтага газеты пускаюць у ход чорныя фарбы, амаль што спаборнічаюць: хто болей «гэткага» надрукуе. Але ж у нашай гісторыі шмат светлых, яркіх старонак, а юнакам і дзяўчатам, якія абдумваюць жыццё, неабходны станоўчы прыклад, «святло ў канцы тунеля». Аднак матэрыялы аб моцных, бескампрамісных людзях, чые перакананні не зламалі ні пакуты сталінскіх катаванняў, ні застойная руціна,— па-ранейшаму рэдкія на старонках газет.

У грамадстве паглыбляецца тэндэнцыя страты ўсялякіх ідэалаў: надта шмат іх было навязана. Маладзёжкі вядуць з чытачом шчырую, бескампрамісную гутарку наконт гэтага. «Да заснавання. А навошта? — так называўся артыкул В. Марынічавай («Комсомольская правда», 30 верасня 1989 г.), які выклікаў цэлы шквал чытацкіх пісьмаў, некаторыя з якіх апублікаваны пад рубрыкай «Як жыць?» — 8, 9 і 12 снежня. «Крах або ўлада ідэалу» — так называецца адна з падборак, дзе чытачы разважаюць пра тое, ці патрэбны ідэал наогул і як пазбавіцца ад ілжывых, уяўных ідэалаў, чым адрозніваюцца ідэалы ад ідалаў, што разумець пад камуністычным ідэалам, у што верыць? Мабыць, гэтыя сумненні і блуканні, спрэчкі з аўтарытэтамі і з сабою і ёсць духоўныя шуканні маладога пакалення, што ажыццяўляюцца з дапамогай друку.

Тэма ўплыву маладзёжнай прэсы на духоўнае станаўленне асобы даволі складаная, патрабуе ўсебаковага асэнсавання і, галоўнае, разумення ў рэдакцыйных калектывах маладзёжных газет.

[1] Маркс К., Энгельс Ф. Соч. Т. 1. С. 79.
[2] Чичановский А. А. Инстанция истины. М., 1989. С. 19.